ДЗІДА

інфармацыйны весьнік
гарадзенскага
маладога фронту

№1 (26)
Сакавік 2008

# 90 ГОД БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ



***Першы ўрад БНР - Народны Сакратарыят: (зьлева направа, сядзяць) Алесь Бурбіс, Іван Серада, Язэп Варонка (старшыня), Васіль Захарка; (стаяць) Аркадзь Смоліч, Пётра Крэчэўскі, Кастусь Езавітаў, Антон Аўсянік, Лявон Заяц***

25 Сакавіка Беларусь сьвяткуе 90-ю гадавіну з дня абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

БНР *была абвешчана выканаўчым камітэтам Рады Ўсебеларускага з'езда 9 сакавіка 1918 г. другой Устаўной Граматай. На паседжаньні Рады БНР у Менску 25 сакавіка 1918 г. была прынята трэцяя* Устаўная Грамата*, у якой Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай дзяржавай і ўсе дзяржаўныя сувязі з Расеяй разрываліся. Такім чынам, 25 сакавіка 1918 года Беларусь зноў стала незалежнай пасьля* 200-гадовага знаходжаньня ў складзе Расейскай Імпэрыі ад канца XVIII ст., калі Беларуска-Літоўская дзяржава (Вялікае Княства Літоўскае) была гвалтам далучана да Расеі.

Гэтая падзея адкрыла нашай краіне шлях у сям'ю вольных і самастойных дзяржаў сьвету, дала беларусам магчымасьць самастойна будаваць сваё жыцьцё, грунтуючыся на прынцыпах дэмакратыі і нацыянальнай незалежнасьці.

Менавіта акт 25 сакавіка 1918 году аб абвяшчэньні незалежнай БНР стаўся ўзорам пры абвяшчэньні незалежнасьці Беларусі ў 1991 годзе, нацыянальныя сымбалі Беларускай Народнай Рэспублікі - герб Пагоня і бела - чырвона - белы сьцяг, былі зацьверджаныя дзяржаўнымі сымбалямі Рэспублікі Беларусь.

На жаль, лёс Беларусі склаўся так, што БНР праіснавала толькі 7 месяцаў. 1 студзеня 1919 года бальшавікі абвясьцілі ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР).

Аднак, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, першая спроба ўтварэньня беларускай дзяржаўнасьці мела вялікае гістарычнае значэньне. Абвяшчэньне незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасьць яе Рады зрабілі ўплыў на развіцьцё нацыянальнай самасьвядомасьці беларускага народа. Не дабіўшыся ўлады, Рада БНР тым не меньш прымусіла бальшавікоў пераглядзець сваю палітыку ў адносінах да беларусаў.

**Вось ўжо 90 год беларускія патрыёты ўсяго сьвету адзначаюць дзень 25 Сакавіка як найвялікшае нацыянальнае сьвята – Дзень Волі.**

Сёлета ўгодкі стварэньня беларускай дзяржаўнасьці беларусы будуць адзначаць шэсьцем і мітынгам. Сябры аргкамітэту выпрацавалі наступны маршрут: **збор 25 сакавіка а 18:00 на плошчы Якуба Коласа, шэсьце па праспэкце Незалежнасьці, вуліцах Валадарскага, Гарадзкі Вал, канчатковым пунктам мусіць стаць помнік Максіму Багдановічу, што ля Опэрнага тэатру.** Цягам акцыі арганізатары плянуюць ускласьці кветкі да помнікаў Якуба Коласа, Янкі Купалы, Адама Міцкевіча і Максіма Багдановіча. Заяўнікамі вулічнай акцыі выступілі Аляксандар Мілінкевіч, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Лябедзька і Мікола Статкевіч.




***Дзень Волі - 2007***

Акрамя масавай акцыі, паводле ўдзельнікаў аргкамітэту, прадугледжваецца шэраг іншых мерапрыемстваў. Сярод іх правядзеньне грамадскага Форуму *"За Незалежнасьць".*

**Сяржук Грышакоў**

# УВАГА! КАНДУКТАРЫ...

*У гарадзенскіх аўтобусах зьявіліся кандуктары. Пакуль яны не караюць “зайцаў” штрафамі, а толькі прапаноўваюць купіць квіток, альбо выйсьці з аўтобусу.*

Справа ў тым, што за студзень бягучага году гараджане заплацілі за праезд на 15 адсодкаў меней, чым у сьнежні мінулага. Задача кандуктараў – высьветліць прычыну гэтай зьявы: ці людзі сталі меней езьдзіць, ці перасталі плаціць. Адначасова Аўтобусны парк праводзіць экспэрымэнт - выгадней утрымліваць кантралёраў, ці кандуктараў.

Дагэтуль у транспарце горада білеты можна было набыць толькі ў кіроўцы, прычым стужкамі па 6 ці 12 штук. Кандуктары прадастаўляюць магчымасьць набываць квіткі паштучна - гэта значны плюс (для тых, хто аплочвае праезд). Штомесяц кандуктар абыходзіцца аўтобуснаму парку ў мільён рублёў. Сёньня іх у горадзе чацьвёра. Працуюць на двух маршрутах па два-тры дні. Калі ў выніку праверкі высьветліцца, што людзі масава перасталі плаціць за праезд, кандуктары застануцца на доўга, і іх штат значна пашырыцца. Яны будуць працягваць прадаваць квіткі , але ўжо прымусова. Калі сёньня студэнт мае магчымасьць праехаць «зайцам», то кандуктары гэтую мажлівасьць могуць бязьлітасна адабраць, устаўшы «мурам каменным» ў дзьвярох аўтобуса (тралейбуса)...




***Моладзь, незаконна пазбаўленая льготаў, хутка адаптуецца да новага віду кантролю***

Застаецца толькі спадзявацца на студэнцкую кемлівасьць.

# Ці пабудуюць АЭС на Гарадзеншчыне?



***Будаўніцтва ЧАЭС***

*У Астравецкім раёне Гарадзенскай вобласьці вядуцца працы па дасьледваньню верагоднай пляцоўкі пад будоўлю атамнай электрастанцыі. І гэта нягледзячы на папярэднія station-неўчыя вынікі па Магілёўскай вобласьці.*

Ужо дасьледаваны дзьве пляцоўкі ў Магілёўскай вобласьці – Краснапалянская (Чаўскі раён) і Кукшыноўская (Шклоўскі раён). І вось трэцяя па ліку, Астравецкая. Гэтая пляцоўка знаходзіцца паміж вёскамі Гоза і Міхалішкі ля аўтадарогі Вільня – Полацак. Лінія сэйсмавыведкі праходзіць якраз праз вёску Валяйкуны .

У Валяйкунах, жыве каля 20 чалавек,зь іх ніхто і не здагадваўся аб верагодным будаўніцтве тут АЭС. Старыя людзі паставіліся да гэтага пафілязофскі – пакуль станцыю пабудуюць, мы пасьпеем памерці.

Жыхары суседніх Міхалішак не разумеюць, каму прыйшло ў галаву разьмяшчаць АЭС у гэтых месцах – багатых на гісторыю, прыроду, і даволі шчыльнанаселеных.

*21 выкладчык трох гарадзенскіх унівэрсытэтаў* – імя Янкі Купалы, аграрнага і мэдычнага – падпісалі незвычайны зварот да ўладаў: яны заклікалі пабудаваць АЭС ў Гарадзенскім раёне. Разьлік такі: калі ўжо вырашана будаваць АЭС, дык пабудуюць. Але калі месца для яе выберуць на захадзе Беларусі, суседнія краіны не дазволяць, каб гэта была станцыя недасканалага ўзору (хутчэй за ўсё расейскага), а значыцца ўладам давядзецца купляць якасны – францускі ці швэдзкі праект. Трэба сказаць, што ня ўсе выкладчыкі, да якіх зьвярталіся ініцыятары, падпісалі ліст у міністэрства энэргетыкі. Большасьць выкладчыкаў супраць атамнай энэргетыкі ў Беларусі. Аднак многія пэсымістычна лічаць: раз вырашылі станцыю будаваць, дык гэта ўжо не спыніць. Хвалюе навукоўцаў іншае: улады спыняцца на самым танным варыянце. Але нават самы танны варыянт адчувальна зьменьшыць бюджэт краіны. Віцэ-прэзідэнт “Атамстройэкспарта” **Аляксандр Глухаў** назваў кошт беларускай АЭС - 8-12 мільярдаў даляраў ЗША. Раней беларусы разлічвалі на іншую лічбу – ад 2,5 да 4 мільярдаў. *Толькі гарадспадарожнік для персаналу атамнай электрастанцыі будзе каштаваць “лішнія” 600 мільенаў даляраў.*

***Канструкцыі любых сучасных АЭС зьяўляюцца «экалягічна небясьпечнымі», бо ў іхную тэхналёгію адразу закладзеныя, па-першае, забруджаньне навакольля і, па-другое, мажлівасьць радыяактыўнага выкіду нават пад час працы ў праектавым рэжыме.***

*Варта адзначыць, што тэрмін эксплюатацыі энергаблёка, які прапануюць Беларусі – 60 год. А тэрмін акупаемасьці – каля 12-15 год. Такім чынам эканамічны эфэкт Беларуская АЭС прынясе толькі недзе ў 2030-2035 гадах.*

***Юрась Пракапюн***

# Развітальны канцэрт NRM

***20 сакавіка ў канцэртнай зале філярмоніі адбудзецца «развітальны канцэрт» NRM.*** *Першы канцэрт у Горадні пасьля доўгага перапынку і першы пасьля візыту рок-музыкаў да кіраўніка ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта Алега Пралясkоўскага. Нагадаем, пад час сустрэчы зь лідэрамі гуртоў N.R.M., Neuro Dubel, «Палац» і «Крама» Пралясkоўскі папрасіў музыкаў больш не выступаць на акцыях апазыцыі. Тыя з гэтым пагадзіліся. У адказ, Пралясkоўскі паабяцаў зьняць забарону з беларускіх гуртоў...*

*Паглядзеўшы на музыкаў, Саша і Сірожа таксама вырашылі наладзіць адносіны з кіраўніцтвам калгасу...*




Паводле *www.gazetaby.com*

# sXe, або што такое Straight edge

*Straight edge - гэта рух альбо нават лад жыцьця, характэрнымі рысамі якога зьяўляюцца поўная адмова ад наркотыкаў, алкаголю, тытуню і выпадковых палавых сувязяў. Мэта "стрэйтэйджэраў" – пастаянны кантроль над сабой і сваімі дзеяньнямі.*



*Straight edge* узьнік у асяродзьдзі амэрыканскіх панк-рок выканаўцаў як заклік супраць папулярызацыі вобраза "*бруднага, пастаянна бухога панка*". У пачатку 80-х ***sXe*** стаў даволі распаўсюджаным сярод амэрыканскіх панкаў, асабліва ў Вашынгтоне і Бостане, дзе была вельмі моцная гард-кор сцэна. Да сярэдзіны 80-х гэтая культура распаўсюдзілася і за межы ЗША, хаця да пачатку 90-х шырокага распаўсюду на іншых кантынэнтах не атрымала.

*Straight edge* - субкультура, якая не прадугледжвае самарэкляму альбо навязваньне sXe-ладу жыцьця усім навакольным, таму ў прыхільнікаў руху няма якіх-небудзь перавагаў у вопратцы, прычосцы і г.д. Адзіны сродак самаідэнтыфікацыі – выкарыстаньне крыжа "X" альбо абрэвіятуры "sXe".

*Крыж на тыльным баку далоні – сымбаль, які з'явіўся на прыканцы сямідзесятых, калі непаўнагадовым, якія прыходзілі ў клюбы на канцэрты, малявалі на далоні крыж, каб ім у бары не прадавалі алкаголь. Такі ж крыж, але ўжо дабраахвотна сталі маляваць сабе прыхільнікі Straight edge.* Тры крыжы – сымбаль трох НЕ: не піць, не паліць, не займацца "выпадковым сэксам". Надпіс DRUG FREE («вольны ад наркотыкаў») альбо POISON FREE («вольны ад атруты»), часта выкарыстоўваюцца на вопратцы. Калі вышэйпрыведзеныя сымбалі маюць выгляд татуйровак - гэта азначае, што іх уладальнік прыняў прынцыпы Straight edge назаўжды.



*Straight edge* – заклікае людзей адмовіцца ад звычак, якія разбураюць чалавека фізычна, духоўна і робяць яго рабом. ***sXe*** заклікае людзей не ісьці жыцьцёвым шляхам, які сканцэнтраваны вакол спагудных звычак, вельмі характэрных для сучаснай поп-культуры. ***sXe*** заўсёды пакідае за чалавекам права вырашаць, на які шлях яму ўставаць, што рабіць, а што не, сьцьвярджаючы, што *ніхто не мае права дыктаваць сваю волю, альбо навязваць яму якую-небудзь ідэалёгію.*

Рух ***sXe*** атрымаў назву ад аднайменнай песьні гурту *Minor Threat*, і заўсёды быў шчыльна зьвязаны з гардкор-панк музыкай. Аднак, апошнім часам з'явіліся *стрэйтэйджэры, якія належаць да культураў эма, рокераў, графітчыкаў і інш.* Гэта сьведчыць аб тым, што становіцца ўсё больш людзей, якія імкнуцца зьмяніць Сьвет да лепшага.

*Прынцыпы sXe:*
*1. Адмова ад наркотыкаў, алкаголю, тытуню.*
*2. Стрыманасьць у сэксе (пастаянны полавы партнэр.*
*3. Антыфашызм*
*4. Вегетарыянства і веганства - нежаданьне мець дачыненьне да сьмерці жывёлін.(не зьяўляецца абавязковай рысай)*

**Цяпер ВЫ можаце чытаць ДЗІДУ ў інтэрнэце: www.dzida.org**
**Падпіска на газэту ажыцяўляецца праз e-mail: dzida@dzida.org**

# Сьпяваем разам

## МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ

***(Афіцыйны гімн БНР)***
***Тэкст Макара Краўцова***

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На вольны родны свой простор,
Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор,
Дамо адпор!

Няхай жыве магутны, сьмелы
Наш беларускі вольны дух,
Вольны дух!
Штандар наш бел-чырвона-белы
Пакрыў сабой народны рух.

На бой! За шчасьце і за волю
Народу слаўнага свайго!
Браты, цярпелі мы даволі…
На бой - усе да аднаго!
Да аднаго!

Імя і сілу беларуса
Няхай пачуе й бачыць той.
Бачыць той!
Хто сьмее нам нясьці прымусы
І першым выкліча на бой.

Браты, да шчасьця мы падходзім:
Хай гром грыміць яшчэ мацней!
Ў крывавых муках мы народзім
Жыцьцё Рэспублікі сваёй!
Жыцьцё Рэспублікі сваёй!

# Напішы палітвязьню

**Андрэю Кіму:** 220050, горад Менск, вул. Валадарскага, д. 2, СІЗА-1, камэра 39.

**Казуліну Аляксандру:** 211300, Віцебская вобл, Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК-3, 1-ы атрад.

ГАЗЭТА ГАРАДЗЕНСКАГА «МАЛАДОГА ФРОНТА»
Галоўны рэдактар: **Кастусь Каліноўскі**
e-mail: dzida@dzida.org
Газэта заснавана ў 1999 годзе
Наклад 299 асобнікаў
Аб`ём 0,5 умоўныя аркушы